**КУПА́ЛЬСКІ ДЗЯДО́К**, добры дух, які ходзіць і збірае купальскія кветкі, з-за чаго яго кошык гарыць, як жар. Пры сустрэчы з ім трэба разаслаць абрус, і К.дз. кіне на яго адну кветку. Шчаслівы яе ўладальнік атрымае дар ведаць пра ўсё на свеце: дзе якія скарбы ляжаць, як да іх прыступіцца, якія закляцці на іх накладзены, як іх адчараваць. Каб захаваць чароўную кветку, трэба, разрэзаўшы далонь правай рукі, закласці яе пад скуру, і адтуль ніякі нячысцік яе не дастане.

*Літ.*: Багдановіч А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Гродно, 1995. С. 30—31.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ